# Беларускае літаратуразнаўства другой паловы XX стагоддзя: набліжэнне да змены даследчай парадыгмы

УДК 8.82.09



**Святлана КАЛЯДКА, доктар філалагічных навук, дацэнт**

Святлана КАЛЯДКА. Беларускае літаратуразнаўства другой паловы XX стагоддзя: набліжэнне да змены даследчай парадыгмы. Артыкул прысвечаны гісторыі беларускага літаратуразнаўства перыяду, звязанага з фарміраваннем метадалагічных прынцыпаў, навуковых падыходаў, метадаў даследавання, зменай даследчай парадыгмы. Асэнсавана роля тэорыі бесканфліктнасці ў маніфестах сацрэалізму, уздзеянне яго ідэалогіі на фарміраванне даследчых стратэгій. Адзначаецца рух навуковай думкі на працягу стагоддзя ў межах сацыялагічнай, культурна-гістарычнай і эстэтычнай школ. Акцэнтуецца ўвага на ўмовах і фактарах фарміравання навуковых школ у беларускім літаратуразнаўстве, на з'яўленні новых метадалогій у вывучэнні літаратуры і методык аналізу мастацкіх твораў.
Ключавыя словы: беларускае літаратуразнаўства, эстэтычны падыход, сацрэалізм, метадалагічныя прынцыпы, навуковая парадыгма, навуковая школа.

Svetlana KOLYADKO. Belarusian literary studies of the second half of the 20th century: Approaching the change in the research paradigm. The article focuses on Belarusian literary studies during the period associated with the formation of methodological principles, scientific approaches, research methods and a change in the research paradigm. The author reflects the awareness of the role of the conflict-free theory in the manifestos of social realism, the impact of its ideology on research strategies. The author makes a note of the development of scientific thought over the course of a century within the framework of sociological, cultural-historical and aesthetic schools of thought. The author draws attention to the conditions and factors in the formation of the schools of thought in Belarusian literary studies and to the emergence of new methodologies in the study of literature and methods of analysis of literary pieces.
Keywords: Belarusian literary studies, aesthetic approach, socialist realism, methodological principles, scientific paradigm, scientific school.

Сучасная навука павінна вырашаць актуальныя для грамадства праблемы, садзейнічаць тэхналагічным прарывам, весці чалавецтва да адкрыццяў, якія дапамогуць палепшыць жыццё. І ў гэтым інавацыйным бесперарыўным працэсе гуманітарным дысцыплінам адводзіцца не апошняе месца. Здаўна філалогія мела вялікае значэнне не толькі ў гуманітарызацыі навуковых ведаў, але і, як сацыяльны інстытут, у пераадольванні дэструктыўных працэсаў у камунікацыі, у фарміраванні светапогляду асобы і ўсёй нацыі. Таму якімі шляхамі развіваецца гуманітарная навука, залежыць, ці паспявае яна адказваць на запыты часу, ці займае патрэбнае чалавеку месца ў інфармацыйнай прасторы, ва ўзаемадзеянні культур у святле маштабных міждзяржаўных інтэграцый.

## Станаўленне літаратуразнаўства як адмысловай дысцыпліны

Беларускае літаратуразнаўства (як і беларуская літаратура) прайшло шлях паскоранага развіцця, вымушана хутка скарачаць дыстанцыю паміж навуковымі ведамі і творчай практыкай: у канцы XIX – пачатку XX стагоддзя нарадзілася шмат мастацкіх твораў, якія неабходна было прааналізаваць, даць ім аб'ектыўную ацэнку,

вызначыць іх месца ў мастацка-культурным працэсе таго часу. Як заўважыў А.А. Лойка, «1870–80-я гады былі пераважна часам рэвалюцыйнай публіцыстыкі, рэвалюцыйных думак аб народзе, 90-я ж сталі гадамі, што пачалі яго мастацкае сцвярджэнне, адлюстраванне, найчасцей апладнёнае рэвалюцыйнай думкай. <…> У сваіх лепшых творах гэтага часу беларуская перадавая літаратура выявіла ўжо шэраг фенаменальных рыс, якія забяспечылі ёй эстэтычную вартасць» *[1, с. 218–219]*. Апісаць «эстэтычную вартасць» літаратуры маглі толькі падрыхтаваныя чытачы. «Літаратурная навука» адчувала дэфіцыт у прафесіянальных даследчыках і крытыках. Практычна ў гарачых дыскусіях на старонках перадавых у той час беларускамоўных газет і часопісаў фарміраваліся індывідуальнасці першых даследчыкаў літаратуры, набываўся досвед у прапагандысцкай і асветніцкай дзейнасці. На гэты час прыпадае актывізацыя навукова-крытычнай думкі, якая адгукалася на попыт на літаратурна-крытычны, аналітычны матэрыял.

Як слушна заўважае Л.Г. Кісялёва, «большасць даследчыкаў падзяляюць думку, што станаўленне літаратуразнаўства як адмысловай навуковай дысцыпліны прыпадае на XIX ст. Да таго часу асэнсаванне літаратурных працэсаў рэдка станавілася самамэтай, а было ўлучана ў сферу філасофіі, эстэтыкі, гістарычных штудыяў і да т. п. <…> Але толькі ў XIX ст., асабліва ў яго другой палове, літаратуразнаўства пачало адасабляцца, больш ці менш рашуча адмяжоўвацца ад іншых гуманітарных навук, усведамляць свае спецыфічныя мэты і задачы, выпрацоўваць уласную метадалогію» (цытуецца па рукапісе Л.Г. Кісялёвай «Літаратурная думка Беларусі ў XVIII–XIX стагоддзях»). Так, беларускае літаратуразнаўства набывае свой навуковы статус менавіта ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя. Выступленні на старонках перыядычных выданняў у гэты перыяд адносяцца пераважна да крытыкі (рэцэнзіі, водзывы, крытычна-аналітычныя артыкулы, агляды і інш.). Як лічыць М.І. Мушынскі, новы перыяд у навуцы аб літаратуры быў распачаты з прац М. Багдановіча, аднаго з заснавальнікаў беларускага нацыянальнага літаратуразнаўства. Гэты факт адзначае і М.А. Тычына: «тэарэтыка-гістарычная і літаратурна-крытычная школа, створаная Максімам Багдановічам, якая знаёміла маладых беларускіх пісьменнікаў з навуковымі і мастацкімі набыткамі сусветнай літаратуры, мела свой плённы ўплыў на іх светапогляд і светаадчуванне і ў выніку вызначала стратэгію эстэтычна-мастацкай эвалюцыі беларускай нацыянальнай культуры» *[2, с. 176]*. У аснову яго прац пакладзены тэарэтыка-метадалагічныя прынцыпы культурна-гістарычнай школы, папулярнай у той час у расійскай навуцы, менавіта ім абазначаны вектар на вывучэнне літаратуры ў сувязі з грамадска-палітычнымі ўмовамі жыцця і духоўным сталеннем асобы і народа, на вызначэнне яе нацыянальных складнікаў, на выпрацоўку сістэмнага ўяўлення пра мастацтва слова.

Пачатак XX стагоддзя, асабліва 1920–30-я гады, у развіцці беларускай навукі быў вельмі пладавітым і ў той жа час супярэчлівым *[3, с. 634]*. Часта працэс навуковага даследавання літаратуры суправаджаўся сацыялагізацыяй гістарычных фактаў, «вульгарызацыяй» высноў, што тлумачылася пошукам кампрамісу паміж аўтарам і выдаўцом, цэнзарам, даследчыкам і адрасатам, навуковай інтэлігенцыяй і ўладай. «Некаторыя крытыкі

**ПРА АЎТАРА**

КАЛЯДКА Святлана Уладзіміраўна.

Нарадзілася на Брэстчыне. Скончыла Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.С. Пушкіна (1993), аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН Беларусі (1996).

З 1997 года працуе ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы (цяпер Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі): малодшым, навуковым, старшым, вядучым навуковым супрацоўнікам.

Доктар філалагічных навук (2021), дацэнт (2011).

Аўтар больш за 200 навуковых работ, сярод якіх чатыры манаграфіі, сем калектыўных манаграфій, пяць вучэбна-метадычных дапаможнікаў у суаўтарстве.

Сфера навуковых інтарэсаў: тэарэтычная паэтыка, літаратуразнаўчая этымалогія, тэксталогія, беларуская паэзія XX–XXI стагоддзяў.

праяўлялі творчую пасіўнасць, ішлі на маральныя кампрамісы. Знізіўся тэарэтычны ўзровень літаратурнай палемікі», – адзначаў М.І. Мушынскі *[4, с. 19]*. Анталагічны статус літаратуразнаўства ўзнімаўся на ідэалагемах «народнасць», «масавасць», «партыйнасць», а навуковую ідэнтычнасць расшыфроўвала ідэалагема «барацьба». Барацьба навукоўцаў з буржуазна-нацыяналістычнымі канцэпцыямі, фармалістычнымі, мадэрнісцкімі ўплывамі, з вульгарнай сацыялогіяй і іншымі ворагамі сацыялістычнага рэалізму прадвызначала «выкананне задачы стварэння, рэпрэзентацыі і сацыяльнай легітымізацыі савецкай ідэалогіі, атрымання народнай падтрымкі» *[3, с. 636]*. Сапраўды, у артыкулах, выступленнях, даследаваннях 1930-40-х гадоў мы знойдзем побач вульгарна-сацыялагічныя пазіцыі і пазіцыі марксісцка-ленінскага вучэння, зварот да прынцыпаў культурна-гістарычнай школы і голы фактаграфізм, пошук найменняў для новай эстэтыкі навуковага пісьма і пасіўнае прытрымліванне навязаных сацрэалістычным канонам каштоўнасцей. Не было сістэмнага падыходу, які мог бы дапамагчы ў акрэсліванні асноў новага літаратуразнаўства. Перад вучонымі стаяла задача фарміравання навуковай ідэнтычнасці, адпаведнай ідэалогіі часу, умацавання яе падмурка скіраванасцю ў метад сацыялістычнага рэалізму – і тады гэты шлях быў санкцыянаваны і падтрыманы ўладай. Праблеме функцыянавання гэтага метаду прысвячаліся асобныя працы *[5, с. 258]*. З сацыяльнай замовай на эстэтычную лінію эвалюцыі літаратуры і літаратуразнаўства трэба было лічыцца і прыхільнікам старых ідэй, і прагрэсіўна настроеным пісьменнікам і навукоўцам. Развіццё навукі аб літаратуры ў сацрэалістычным дыскурсе было аплоднена рэцыдывамі тэорыі бесканфліктнасці (дагматычнай, адарванай ад жыцця тэорыі). Як трапна заўважыў М.І. Мушынскі, «у творах, напісаных пад яе ўплывам, адлюстраванне рэальных супярэчнасцей часу падмянялася схемай. Замест рэальных жыццёвых канфліктаў – барацьба добрага з лепшым, замест паўнакроўных характараў – ідэальныя героі» *[4, с. 46]*. Аналіз твораў з высокай ідэалагічнай мадальнасцю часта пераўтвараўся ў дэманстрацыю крытэрыяў эталоннасці. Легалізацыя графаманскіх тэкстаў у якасці высокамастацкіх адбывалася пад знакам падмены значэнняў, крытэрыяў, каштоўнасцей. У адных выпадках даследчыкі свята верылі ва ўласныя ацэнкі твора, у іншых – уключаліся маніпулятыўныя прыёмы дзеля выяўлення лепшага, вартага ўвагі ў мастацкай творчасці сярод шэрага прахаднога. Часам, чытаючы навуковую працу, неабходна было ведаць коды да ідэйнай раскадзіроўкі інфармацыі, і дасведчаныя, прафесійныя чытачы іх знаходзілі, пераадольваючы разам з аўтарам цэнзурныя бар'еры. Пасля выхаду ў 1946 годзе Пастановы ЦК ВКП(б) па літаратуры разгарнулася барацьба з безыдэйнымі ці ідэалагічна шкоднымі публікацыямі, узмацніўся партыйны кантроль за творчай інтэлігенцыяй. І ўсё ж насуперак сацыяльнаму ўціску ў першай палове XX стагоддзя нараджаліся беларускія некананічныя, ідэалагічна чужыя для свайго часу творы, аналізу якіх шмат увагі ўдзяліў М.І. Мушынскі і якія да гэтага часу раскадзіруюцца сучаснымі навукоўцамі.




## Шлях пошукаў

Менавіта ў другой палове XX стагоддзя сутыкнуліся розныя метадалагічныя сістэмы ў навуковай інтэрпрэтацыі літаратурных фактаў: паступова сыходзіў сацрэалізм з дамінантай ідэалагічнага вектара ў навуковых працах, а яго месца імкнуўся заняць структуралізм, а затым і постструктуралізм.

1950–70-я гады ў замежным літаратуразнаўстве – час росквіту такіх напрамкаў і плыняў, як структуралізм, «новая крытыка», якія падрыхтавалі глебу для нараджэння постмадэрнізму, дэканструктывізму, постструктуралізму, актывізацыі такіх дысцыплін і метадалогій, як герменеўтыка, фенаменалогія, рэцэптыўная эстэтыка і інш. (Асноўныя метады навуковых тэорый у межах названых напрамкаў і плыняў былі больш-менш асвоены беларускімі літаратуразнаўцамі толькі ў канцы XX – пачатку XXI стагоддзя.) Гісторыка-біяграфічны,

эстэтычна-стылістычны, тэкстуальна-аналітычны метады, методыка «пільнага прачытання тэксту» і іншыя панавалі ў тэарэтыка-гістарычных працах. Вылучалася патрабаванне дэталёвага аналізу тэксту, успрыманне літаратурнага твора ва ўзаемасувязі ўсіх яго элементаў, улічваўся фактар нормы ў яго будове.

У 1980-я гады вярнулася цікавасць да культурна-гістарычнага метаду, да фенаменалогіі і герменеўтыкі гістарычнай школы, паглыбляецца ўвага да ўспрымання літаратуры і асобнага тэксту, узмоцненая ў аналізе выкарыстаннем метаду рэцэптыўнай эстэтыкі і сацыялагічных даследаванняў. Даследчыкі імкнуцца да філасофска-літаратурнага абагульнення – асэнсавання і абгрунтавання своеасаблівасці літаратуры ў складзе культуры. І гэта агульнасусветная тэндэнцыя адгукаецца ў беларускім літаратуразнаўстве.

І ўсё ж цяжка назваць прарыўныя ідэі ў беларускай навуцы аб літаратуры другой паловы XX стагоддзя, якія маглі скалыхнуць асновы старога беларускага літаратуразнаўства і стаць рэвалюцыйнымі ці інавацыйнымі ў змене навуковай парадыгмы, стварэнні новых метадалагічных сістэм. Бо, як адзначаў Я.Ф. Трушчанка, вучоны сакратар аддзялення літаратуры і мовы АН СССР (1962–1973), расійская «айчынная навука аб літаратуры і літаратурная крытыка разглядалі літаратуру як форму ідэалогіі. Панавальная ідэалогія ў вялікай ступені вызначала трактоўку літаратурнага працэсу, дзейнасць вядучых літаратуразнаўцаў і крытыкаў, пастаноўку тэарэтычных праблем эстэтыкі і стылістыкі мастацкай літаратуры, пытанні метадалогіі літаратуразнаўства» *[6, с. 77]*. Тое ж адбывалася і ў беларускім літаратуразнаўстве. Хутчэй можна гаварыць пра з'яўленне новых паваротаў, ці спосабаў, у апісанні гісторыі беларускай літаратуры, што адзначаны М.А. Тычынам у якасці дасягненняў беларускіх даследчыкаў: «Аб гэтым сведчаць „прарыўныя ідэі“ навуковых прац А. Адамовіча, які бачыў беларускую прозу на „літаратурнай планеце“, Р. Бярозкіна, які ацэньваў здзейсненае сучаснай беларускай паэзіяй як „звенні“ вялікага еўрапейскага ланцуга культурнага развіцця, В. Каваленкі, які напомніў сучаснікам пра прарочую ідэю М. Багдановіча аб паскораным развіцці беларускай нацыі, яе мовы, культуры, літаратуры і які грунтоўна, на высокай тэарэтычнай ноце распрацаваў яе на матэрыяле новай беларускай літаратуры XIX–XX стст., І. Ралько, які бачыў „беларускі верш на ўсіх вятрах суровае эпохі“ і скрупулёзна даследаваў яго патэнцыяльныя эстэтычныя магчымасці, В. Рагойшы, які асэнсоўваў беларускія пераклады не проста як пераклады з мовы на мову, а з культуры на культуру» *[2, с. 205–206]*. Прафесар М.І. Мушынскі нібы працягвае пералік навуковых дасягненняў: у 1960-я гады ў манаграфічных працах «Грынчыкам упершыню ў беларускім літаратуразнаўстве рабілася спроба раскрыць працэс фарміравання фалькларыстычных поглядаў М. Багдановіча. Упершыню адлюстраванне вялікай прозай тэмы героікі народа ў Вялікай Айчыннай вайне Дзюбайла і Пашкевіч разглядалі як самастойную з'яву. Таксама ўпершыню Д. Бугаёў у якасці аб'екта спецыяльнага манаграфічнага даследавання абраў прозу М. Лынькова даваеннага часу, а Лойка – паэму Я. Коласа „Новая зямля“» *[5, с. 277]*. Але ж М.І. Мушынскі гаварыў пра навуковыя дасягненні цягам аднаго дзесяцігоддзя.




«Гісторыка-літаратурны працэс – не проста шлях да новых вяршынь, шлях да перамог. Гэта абумоўлены гістарычнымі, грамадскімі, спецыфічна-нацыянальнымі, культурна-творчымі фактарамі складаны шлях пошукаў, гэта няспынны рух у сутыкненнях, у барацьбе супрацьлеглых тэндэнцый», – слушна выказаў сваё меркаванне пра літаратурны працэс М.І. Мушынскі *[7, с. 30–31]*. Аднак яго выказванне таксама характарызуе шлях літаратуразнаўства. Можна назваць стан беларускага літаратуразнаўства канвенцыянальным, адпаведным часу, традыцыі, канону, умоўна прынятым за норму, узгодненым уладай і дзяржаўнымі інстытуцыямі. Крытыка хутчэй за тэорыю літаратуры прыстасоўвалася да новых змен у літаратуры і іх чарговай кадыфікацыі ў якасці бягучага рэпрэзентанта новай літаратурнай сітуацыі. Безумоўна, сёння мы лёгка вылучаем у эпосе сацрэалізму ў літаратуразнаўстве штучныя механізмы канструявання даследчых метадалогій і метадаў, падпарадкаваных законам закрытай аўтарытарнай сістэмы. Аднак у любым перыядзе і любой установе будуць тыя даследчыкі,

якія служаць ідэі і ўмоўна створаным канструктам кшталту народная літаратура, літаратура сацыялістычнага рэалізму, і тыя, якія могуць дыстанцыявацца ад гіпертрафіраваных і недзе гіпербалізаваных стандартаў ідэалогій. Міхась Тычына прапаноўвае наступнае размежаванне прыхільнікаў розных школ: «Метадалагічна акадэмічны істэблішмент арыентаваны на „рэалістычныя“ ўстаноўкі традыцыйнай школы, а „вольная“ філалогія суадносіць сябе з эстэтыкай мадэрнізму і постмадэрнізму. <…> Замест апрабаваных у савецкія і постсавецкія часы тэарэтычных прынцыпаў, сярод якіх варта назваць эстэтычны падыход, канкрэтна-гістарычны аспект, кантэкстуальнае даследаванне, цэласны разгляд, літаратурны этыкет (у апублікаваных крытычных матэрыялах. – *Аўт.*), перад намі вельмі часта (часцей, чым чакаецца) паўстаюць праявы дылетантызму, правінцыялізму, прэтэнцыёзнасці, мазахісцкага самаедства» *[2, с. 178]*. Трэба дадаць, што ў ацэнцы дзейнасці даследчыка варта ўлічваць яшчэ фактар асабістай навуковай прыхільнасці да тэорыі ці гісторыі, да старажытнай ці сучаснай літаратуры, наяўнасць самастойнага спосабу навуковага мыслення і асаблівага аналітычнага светаўспрыняцця, нават яго ўзрост і досвед. Важна і тое, адчувае ён сябе ўтульна ў межах універсальных норм літаратуразнаўчых ведаў або шукае сябе новага праз парушэнне, руйнаванне правіл ці праз распрацоўку ўласных кодаў навуковых ісцін.

Ці магчыма сёння існаванне навуковых школ? З аднаго боку, так, улічваючы наяўнасць падобных, як блізняты, літаратуразнаўчых прац, у якіх відавочны зварот да даўно састарэлага навукова-даследчага інструментарыю. У час, калі літаратуразнаўствам прапануюцца сотні метадалогій, падыходаў, напрамкаў для асэнсавання мастацкіх з'яў, калі прэвалююць міждысцыплінарныя сувязі і існуе магчымасць выбару метадаў розных гуманітарных навук, наяўнасць мноства школ у практыцы не ўяўляем. А тым больш улічваючы факт пашырэння жанравых магчымасцей навуковых распрацовак: «На старонках друку часцей сталі з'яўляцца літаратурныя нататкі, эсэ, творчыя партрэты і г. д., у той час як у папярэднія гады адзінай, універсальнай формай крытыкі былі артыкул і рэцэнзія» *[5, с. 168]*.

Так званая сацрэалістычная навуковая школа дамінавала на працягу амаль усяго XX стагоддзя. Міхась Тычына спачатку адзначаў, што «ўласных літаратуразнаўчых школ беларускія тэарэтыкі не стварылі, хаця адпаведныя памкненні і праекты ўзнікалі ў перыяды актывізацыі ідэі нацыянальна-культурнага адраджэння» *[2, с. 22]*, а пазней у калектыўнай манаграфіі аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры «Тэорыя літаратуры ў дыялогу еўрапейскіх культур» (2018) вылучыў і падрабязна апісаў міфалагічную, культурна-гістарычную, біяграфічную, вершазнаўчую, марксісцкую школы *[8, с. 52–99]*, а таксама назваў актуальныя ў другой палове XX – пачатку XXI стагоддзя параўнальна-гістарычную, тыпалагічную, псіхалагічную, семіётыка-структуралісцкую, сацыялагічную, этычна-этнічную, тэксталагічную школы і сучасныя – семантычна-сімвалічную, фонасемантычную, герменеўтычную, вершазнаўча-матэматычную, рэцэптыўна-фенаменалагічную, нараталагічную і іншыя школы *[8, с. 53]*. Не хочацца спрачацца з вядомым таленавітым вучоным, аднак, нам падаецца, самі назвы акумулююць розныя крытэрыі, злучаюцца ў іх разам навуковыя канцэпцыі, ідэі і тэорыі, угрунтаваныя на ўласных методыках і метадах даследавання. Навуковыя ўнутрыгаліновыя і міжгаліновыя напрамкі, галіны ведаў, навуковыя школы – усё перакрыжавалася і пераблыталася ў пералічэннях, зробленых М.А. Тычынам. Аднак за кожным вызначэннем навуковай школы стаіць у найлепшым выпадку адзін-два беларускія вучоныя, а да некаторых пазіцый існуючых у свеце школ толькі далучыліся ў асобных працах лічаныя даследчыкі. Немагчыма ідэнтыфікаваць навуковую школу, напрыклад, толькі паводле факту выканання адзінага задання калектывам усяго аддзела: усё роўна кожны знойдзе ўласны ракурс інтэрпрэтацыі навуковай праблемы, прыменіць адпаведныя яму метады і прыёмы даследавання. Наяўнасць агульнагуманітарнай традыцыі і яе пераемнасць, адзінага навуковага напрамку, сэнсавага метадалагічнага цэнтра, базавых ідэй і праграм даследчыкаў, трансфармацыі канцэпцый, сувязі з першаснымі ідэямі і другаснымі канцэпцыямі, а таксама іх уздзеянне на навуковы і культурны працэс (А.Р. Бермус *[9]*) – гэтыя і іншыя аспекты, якія дазваляюць назваць спецыфічны гуманітарны феномен навуковай школай, вельмі цяжкаважныя і малаздзяйсняльныя ў сучасным літаратуразнаўстве, якое не мае магчымасці доўга засяроджвацца на адной тэорыі, канцэпцыі, ідэі ў дыскурсе метадалагічнага плюралізму, пры бясконцых дыялогах навук у шматузроўневай камунікатыўнай прасторы, пры хуткіх тэмпах нарастання навуковай інфармацыі.

Сучасныя «вышукальнікі» сваімі працамі задаюць агульныя напрамкі ў новае літаратуразнаўства, незалежнае ад навуковых школ, якое фарміруе новыя веды аб сутнасці і законах развіцця мастацкай літаратуры, яе сацыяльна-культурным функцыянаванні, аб прачытанні і інтэрпрэтацыі мастацкага і немастацкага тэксту і інш. Антрапалагічнае, псіхалагічнае, псіхіятрычнае, гісторыка-функцыянальнае і гэтак далей літаратуразнаўства ў сваіх інавацыйных адкрыццях і стратэгіях сёння вызначае палітыку разнавектарнасці ці «дысгарманічнага шматгалосся» (А.Р. Бермус) у навуцы, і думаем, іх колькасць будзе павялічвацца.



Гістарычныя, тэарэтычныя і тэксталагічныя даследаванні беларускіх літаратуразнаўцаў

Наперадзе таксама павелічэнне метадык прачытання тэксту, і хацелася б, каб кожны тэкст таленавітага аўтара заслугоўваў індывідуальных падыходаў, пра што дбаў М.І. Мушынскі: «Бярозкін прапаноўваў выкарыстоўваць тэрмін „лірычны характар паэта“, а не звыклае, традыцыйнае „лірычны герой“, таму што апошні тэрмін не стасаваўся да ваеннай лірыкі паэта – у такой ступені лёс лірычнага героя Панчанкі быў зніітаваны з рэальнай біяграфіяй паэта». Уласцівы Панчанку метад тыпізацыі, гаварыў крытык, адрозніваецца ад метаду тыпізацыі ў Куляшова *[5, с. 215]*. Аднак убачыць розныя метады тыпізацыі ў выбітных паэтаў можна тады, калі ты ўважліва чытаеш, углядваешся ў словы, услухоўваешся ў гукі, адчуваеш тое, што над тэкстам і ў падтэксце, забыўшыся пра адзіную ўніверсальную логіку пазнання ўсёй шматстайнасці літаратурнага жыцця, да якой ты прызвычаіўся, засвойваючы асновы літаратуразнаўства ў ВНУ, аспірантуры, затым уласнай даследчыцкай практыцы. Бо гэтай адзінай логікі не існуе, у кожнага аўтара ёсць жаданне быць пачутым *[2, с. 180]*. Будзем спадзявацца, што аддаючы даніну таленавітаму пісьменніку таленавітым навуковым яго прачытаннем мы будзем садзейнічаць павышэнню грамадскага статусу гуманітарнай навукі.

## Асоба даследчыка і яго светапогляд

З аднаго боку, 1990-я гады адрозніваюцца ўласнай ідэалогіяй, эстэтыкай, гісторыка-культурнай дынамікай, з другога – запомніліся абазначаным антрапалагічным крызісам, яркімі палемічнымі дыскусіямі, дыскрэдытацыяй ранейшых метадалагічных падыходаў і іншым, што прымушае не закранаць гэту старонку беларускага літаратуразнаўства ў нашым артыкуле: яна патрабуе амаль хірургічнага ўмяшання і прымянення, акрамя аналітычных, гісторыка-функцыянальных метадаў і прыёмаў, яшчэ і новых гіпотэз, ракурсаў інтэрпрэтацыі, ці не спецыяльна сканструяваных тэхналогій даследавання. Ці перажыло беларускае літаратуразнаўства ў гэты гістарычны перыяд эстэтычную рэвалюцыю? Безумоўна, так, але з меншымі наступствамі для яго статусу, чым у іншых краінах. З аднаго боку, сыходзяць з навуковай арэны ўніверсальна-ўсеагульныя катэгорыі, якія суправаджалі рух навукі аб літаратуры ад сацыялагічнай да эстэтычнай яе ідэнтычнасці, адбываецца пераразмеркаванне аўтарытэтаў у сферы навуковай інфармацыі, паралельна ідуць працэсы інтэграцыі сістэмы ведаў і іх міждысцыплінарны сінтэз, абнаўляюцца даследчыя метадалагічна-тэарэтычныя ўстаноўкі. З другога боку, традыцыйныя навуковыя веды пазбаўляюцца статусу самакаштоўнасці, сыходзяць з пастаменту сацрэалізму, губляюць акадэмічна-ўніверсітэцка-інстытуцыялізаваную рэпутацыю і становяцца неад’емнай

часткай камунікатыўнага дыскурсу. Пачынаюць супрацьборстваваць розныя тыпы метадалогій: пазітыўна скіраваныя на аднаўленне «мноства літаратур», тэкстаў у пэўнай цэласнасці і арыентаваныя на раскладанне і дэканструкцыю даследаванага перыяду, творчасці, тэксту. Эсэізацыя навуковых ведаў і іх падачы ў артыкулах, навуковых працах, выступленнях у перыядычным друку, на радыё і тэлебачанні даўні і даволі энергічна-экспрэсіўны працэс, які актывізаваў у гэты час пэўныя як прагрэсіўныя, так і дэструктыўныя тэндэнцыі ў развіцці літаратуразнаўства. «Літаратурны мейнстрым у канцы XX ст. паўстаў больш паўнаводным, шматстайным, унутрана інтэнсіўным і напружаным, эстэтычна ўзвышаным, на ўсю моц выяўляла сябе глыбокая плынь літаратурнага жыцця, якая ўрэшце і вызначае змест, ход і напрамак культурнага прагрэсу, відавочна павысіўся міжнародны статус нашай мастацкай літаратуры. З незаслужанага забыцця былі вернуты многія пісьменніцкія імёны і цэлыя літаратурныя напрамкі, плыні і школы, у сферу навуковага асэнсавання трапілі многія забароненыя і паўзабароненыя паводле ідэалагічных прыкмет мастацкія творы, што ў выніку значна змяніла літаратурны ландшафт цэлай эпохі», – адзначаў М.А. Тычына *[2, с. 55]*. Гэта, безумоўна, змяніла і расстаноўку «сіл» у беларускім літаратуразнаўстве, што дазваляе гаварыць аб змене ў 1990-я гады літаратуразнаўчай парадыгмы, з'яўленні і легітымізацыі розных даследчых праграм, усталяванні гетэрагеннасці навуковага дыскурсу і плюралізму метадалагічных падыходаў да вывучэння феномену мастацкай літаратуры. Працэс пераходу ад метадалогій сацрэалізму, структуралізму да метадалогій постструктуралізму, постмадэрнізму, дэканструктывізму, засваення метадаў рэцэптыўнай эстэтыкі, герменеўтыкі, «новай крытыкі», гендаралогіі, фенаменалогіі літаратуры і іншага расцягнуўся на гады, і яго астаткавая дэфармацыя назіраецца і сёння. Канцэптуальныя і метадалагічныя арыентацыі літаратуразнаўства заўсёды рэлевантныя сучаснаму культурнаму дыскурсу. Уся другая палова XX стагоддзя адзначана функцыянаваннем шырокай і ўплывовай інтэрдысцыплінарнай ідэйна-эстэтычнай плыні, якая атрымала назву «постструктуралісцка-дэканструктывісцка-постмадэрнісцкага комплексу» *[10, с. 8]*, які ахапіў розныя сферы гуманітарных ведаў, у тым ліку і літаратуразнаўства. Працэс нараджэння мноства гетэрагенных метадалагічных канцэпцый працягваецца ў беларускай навуцы і ў першай палове XXI стагоддзя: штосьці з сусветнай практыкі ўваходзіць у яго структуры натуральна, штосьці запазычваецца з пэўнымі складанасцямі, а штосьці не знаходзіць глебы для прарастання. У сучасных навуковых працах рэпрэзентуюцца прынцыпы і спосабы перманентнай самарэфлексіі даследчыкаў у межах вузка абраных навуковых напрамкаў. Увогуле можна сцвярджаць, што ў першай палове XXI стагоддзя рэфлексуючае літаратуразнаўства займае дамінантныя пазіцыі, а рэфлексіўнасць літаратуразнаўчага дыскурсу паўстае платформай для нараджэння новых тэорый і метадалогій, якія выводзяць даследчыка за межы філалагічных ведаў, патрабуюць далучэння і інтэрактыўнай камунікацыі ведаў гуманітарных навук. Актыўна запазычваюцца, інтэрпрэтуюцца ў адпаведнасці з беларускім матэрыялам і інтэгрыруюцца канцэпцыі тэорыі і гісторыі. Калі акадэмічнае літаратуразнаўства ідзе шляхам паступовага, недзе запаволенага, але ж засвойвання дасягненняў сусветнага літаратуразнаўства, то на пляцоўках інтэрнэту мы можам назіраць за мноствам самапрэзентацыйных праграм асобных даследчыкаў і «актыўных» чытачоў з прапагандай адпаведных ім сацыякультурных і духоўных сэнсаў, норм і каштоўнасцей, у якіх адчувальна прывязка да беларускай гісторыі. Месца «…у цэнтры сучасных культурных дэбатаў занялі новыя паняцці – „разнастайнасць", „рэлятывізм", „культурныя адрозненні" і, нарэшце, праславутая „іншасць", як і паэтыка і палітыка самавызначэння „іншага", што стала гэтак моднай у апошнія гады» *[11, с. 23]*. Так, пералічаныя паняцці характарызуюць стан сучаснай навуковай думкі і, больш за тое, абазначаюць шляхі яе мадыфікацый. Відавочны шлях да асобасна-суб'ектыўнага літаратуразнаўства – дысцыпліны, у якой першаступеннае значэнне будзе мець Асоба даследчыка і яго ўнікальны светапогляд, што ўплывае на з'яўленне ўласнай інтэрпрэтацыі тэорыі і гісторыі літаратуры. Па вялікім рахунку, стан сучаснага літаратуразнаўства абумоўлены не сумай школ, а сумай асоб у навуцы аб літаратуры, гэты працяг самы плённы.

Навуковая практыка нам дэманструе, як умела выкарыстоўваюцца класічныя ўзоры беларускіх даследаванняў для стварэння новых літаратуразнаўчых метадалогій. Адна з іх – рэпрэзентатыўная канцэпцыя беларускай літаратуры як прэзентанта нацыянальнага самавызначэння. Не менш актуальная культурная арыентацыя

на новае, глабальнае адраджэнне нацы з вяртаннем у жыццё беларускай мовы. Метадалагічныя ўстаноўкі сучаснай літаратуразнаўчай парадыгмы характарызуюцца семантычнай амбівалентнасцю: з аднаго боку, прыцягальным застаецца фальклор і народная творчасць як грунт нацыянальнай літаратуры, з другога – адкідваецца традыцыя і позіркі даследчыкаў накіроўваюцца ў пласты вузкаскіраваных тэорый ці канкрэтных гістарычных перыядаў у пошуках форм развіцця беларускай літаратуры па ўласных іманентных законах. Аднак наяўнасць нарматыўных асноў беларускага навуковага дыскурсу – пытанне адкрытае, нават дыскусійнае. Спосабы бачання свету, сістэма прадпісанняў, мадэлі пастаноўкі пытанняў і іх рашэння – усё гэта павінна вызначаць сутнасць новай літаратуразнаўчай парадыгмы, зместам якой кіруе XXI стагоддзе. Можна сказаць, што літаратуразнаўчая парадыгма сёння ўяўляе сінкрэтычны тып дыскурсу, які змяшчае кампаненты гетэрагенных дыскурсіўных практык (І.В. Кандакоў). Сутнасць «дысцыплінарнай матрыцы» (выражэнне амерыканскага філосафа Томаса Куна) сёння, як і раней, грунтуецца на сістэме стандартных метадаў базавай літаратуразнаўчай парадыгмы ў канфліктным палілогу канцэпцый. Мадыфікацыі літаратурнага дыскурсу патрабуюць новых сродкаў апісання, а таму сучаснаму літаратуразнаўству належыць канстытуяваць сябе пры дапамозе прынцыпу ўзаемадапаўняльнасці з выхадам на ўзровень метамовы культуры і нацыі.

Літаратуразнаўства як разгалінаваная і аўтаномная сістэма эстэтычных ведаў можа быць той дысцыплінай, якая каардынуе адносіны паміж аўтарам – тэкстам – чытачом, вызначаючы сістэму каштоўнасцей, духоўную сутнасць літаратуры і прапагандуючы іх у розных формах у якасці культурнага базісу нацыянальнай навукі. Арганізаваць хаос жыцця літаратуры – асноўная задача тэорыі і гісторыі літаратуры. Сёння, калі мы можам назіраць за глабальнымі тэндэнцыямі ў культуры і літаратуры на аснове плюралістычнай культурнай парадыгмы, полікультуры (М. Тластанава), поліпарадыгмальнасці літаратуразнаўчага пазнання, даць адназначнае вызначэнне гуманітарных ведаў, функцый літаратуразнаўства, вылучыць яго тыпалагічныя ўласцівасці вельмі цяжка. І ўсё ж літаратуразнаўства можа і павінна стаць сістэмаўтваральнай асновай сацыяльна-гуманітарных навук.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 14.07.2023 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Лойка, А.А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Падручнік для філалагічных факультэтаў ВНУ: у 2 ч. / А.А. Лойка. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск: Выш. шк., 1989. – Ч. 2. – 480 с.
2. Тычына, М.А. Філасофія літаратуры: беларускі варыянт / М.А. Тычына. – Мінск: Беларуская навука, 2014. – 322 с.
3. Гулак, Н.А. Беларуская фалькларыстыка ў кантэксце ідэй і практыкі сацрэалізму / Н.А. Гулак // Доклады Национальной академии наук Беларуси. – 2019. – Том 63, № 5. – С. 633–640.
4. Мушынскі, М.І. Беларускае савецкае літаратуразнаўства / М.І. Мушынскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 96 с.
5. Мушынскі, М.І. Беларуская крытыка і літаратуразнаўства: 40-я – першая палавіна 60-х гадоў / М.І. Мушынскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 344 с.
6. Трущенко Е.Ф. Академическая наука о литературе в 60-80-е годы: заметки ученого секретаря ОЛЯ АН СССР / Трущенко Е.Ф., Ревякина А.А. // Наука о литературе в ХХ веке: (История, методология, лит. процесс): сб. ст. / Рос. акад. наук, Ин-т науч. информ. по обществ. наукам; редкол.: А.А. Ревякина (отв. ред. и сост.) [и др.]. – М.: ИНИОН РАН, 2001. – С. 77–96.
7. Мушынскі, М.І. І нічога, апроч праўды: якой быць «Гісторыі беларускай літаратуры» / М.І. Мушынскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 128 с.
8. Тэорыя літаратуры ў дыялогу еўрапейскіх культур / М.А. Тычына [і інш.]; навук. рэд. М.А. Тычына; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – 550 с.
9. Бермус, А.Н. Введение в гуманитарную методологию / А.Н. Бермус. – М.: Канон, 2007. – 336 с.
10. Ильин, И.П. Постструктурализм. Деконструктивизм. Постмодернизм / И.П. Ильин. – М.: Интрада, 1996. – 256 с.
11. Тлостанова, М.В. Проблема мультикультурализма и литература США конца ХХ века / М.В. Тлостанова; Рос. акад. наук. Ин-т мировой лит. им. А.М. Горького. – М.: ИМЛИ РАН: Наследие, 2000. – 396 с.